# Шчасце ў канверце?

Многія грамадзяне сутыкаліся з сітуацыямі, калі іх праца аплачвалася не пераводам на банкаўскую карту, а перадачай грошай з рук у рукі. З аднаго боку, гэта лёгкія грошы, якія ніколі не бываюць лішнімі. Але з іншай - у падобнай сітуацыі шмат падводных камянёў, аб якіх людзі задумваюцца занадта позна.

Пакуль усё задавальняе, ніхто нікуды звяртацца не стане.

Не варта забываць аб тым, што ў чалавека, які атрымлівае заработную плату <ў канверце>, адсутнічаюць афіцыйныя звесткі аб фактычна атрыманай заработнай плаце, так што могуць узнікнуць пэўныя негатыўныя наступствы.

Атрыманне заработнай платы <ў канверце> або нявыплата работадаўцам абавязковых страхавых узносаў у бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь у далейшым можа стаць прычынай да вылічэння пенсіі ў меншым памеры, а таксама да страты права на законную пенсію з-за адсутнасці стажу.

Права на працоўную пенсію па ўзросце прадастаўляецца пры наяўнасці стажу работы з выплатай абавязковых страхавых узносаў у бюджэт фонду.

Згодна з заканадаўствам аб пенсіённым забеспячэнні ў 2024 годзе права на працоўную пенсію па ўзросту маюць асобы, у якіх страхавы стаж складае 19 гадоў і 6 месяцаў (не менш як 20 гадоў для тых, хто выходзіць на пенсію ў 2025 годзе). У страхавы стаж залічваюцца толькі тыя перыяды работы, за якія праводзілася выплата абавязковых страхавых узносаў у бюджэт фонду. Пры гэтым агульны працоўны стаж павінен складаць 25 гадоў (для мужчын) і 20 гадоў (для жанчын).

Такім чынам, на сёння актуальна не толькі з якой сумы заробку плацяць страхавыя ўзносы за работніка, але і за які перыяд працоўнай дзейнасці.

Напрыклад, калі наймальнік, пераследуючы ўласную выгаду, афіцыйна афармляе грамадзяніна на 0,5 стаўкі, выплачвае афіцыйную заработную плату 300 рублёў, г.зн. ніжэй за мінімальную заработную плату (на сёння - гэта 626 рублёў), а дадаткова выдае <прэмію ў канверце>, то страхавы стаж будзе разлічвацца не за ўвесь адпрацаваны перыяд, а з улікам папраўчнага каэфіцыента.

У выпадку ўзнікнення праблем са здароўем, работнік не атрымае аплату бальнічнага ліста або атрымае толькі з разліку мінімальнай заработнай платы.

Напрыклад, калі грамадзянін працуе без заключэння працоўнага дагавора, а выплата заработнай платы ажыццяўляецца толькі <ў канвертах> без выплаты страхавых узносаў, значыць, у яго адсутнічае права на атрыманне выплат па лістках непрацаздольнасці. Таму калі чалавек захварэе, то давядзецца хварэць за кошт уласных сродкаў.

Калі ж афіцыйная заработная плата работніка, напрыклад, складае 500 рублёў, а да гэтага бонусам ідзе <канверт>, то пры вылічэнні сумы дапамогі

па часовай непрацаздольнасці, у разлік будзе брацца толькі афіцыйная заработная плата.

Пры вырашэнні пытання аб атрыманні банкаўскага крэдыту работнік можа разлічваць на памер крэдыту, вызначаны банкам толькі з улікам афіцыйнага ўзроўню яго даходаў.

Грошы, атрыманыя ў канвертах, даволі праблематычна выкарыстоўваць для набыцця жылля, аўтамабіля, аплаты за навучанне дзяцей і іншыя буйныя выдаткі. Бо падобныя аперацыі знаходзяцца пад кантролем падатковых органаў, дзе вы павінны будзеце пацвердзіць свае выдаткі наяўнасцю легальных крыніц.

Такім чынам, будучыня кожнага грамадзяніна, перш за ўсё, у яго ўласных руках: ці атрымліваць афіцыйную зарплату, ці пагаджацца з прапанаванымі ўмовамі атрымання заработнай платы <ў канверце> і заставацца сацыяльна неабароненым, пазбаўляючы сябе права атрымліваць сацыяльныя выплаты.

Вельмі часта грамадзяне працуюць, не падазраючы аб тым, што наймальнік не выплачвае за іх страхавыя ўзносы ў бюджэт фонду, або адлюстроўвае ў звестках персаніфікаванага ўліку не ўсю суму заробку.

З 1 лютага 2023 года запрацаваў мабільны дадатак <ФСАН>. Цяпер грамадзяне маюць магчымасць атрымаць падрабязную інфармацыю аб даных іх індывідуальнага асабовага рахунку самастойна пачынаючы з 01.01.2003: а менавіта інфармацыю аб перыядах работы ў розных арганізацыях як па працоўным, так і па грамадзянска-прававых дагаворах, за якія былі выплачаны абавязковыя страхавыя ўзносы, даныя аб налічанай заработнай плаце па месяцах і сумы выплачаных узносаў.

Наймальнікам, якія практыкуюць незаконную схему аплаты працы, трэба нагадаць, што ў Рэспубліцы Беларусь вядзецца актыўная работа па выяўленні выпадкаў выплаты заработнай платы "ў канвертах". Апроч адміністрацыйнай адказнасці наймальнік можа панесці і крымінальную адказнасць у адпаведнасці з артыкулам 243-3 <Ухіленне ад выплаты сум падаткаў, збораў> Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

А тым, хто ўсё ж атрымлівае заробак <у канверце>, варта задумацца, а што будзе заўтра?